
Вялікі пост у сэрцах малых

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
21.02.2021 00:00

Каб вера была жывой, трэба яе перадаваць з пакалення ў пакаленне, і лепш пачынаць як мага раней. Тлумачыць хрысціянскія асновы дзецям варта адмысловым спосабам, тады і наша супольная вера будзе плённай. Уваходзячы ў перыяд Вялікага посту, скарыстаем практычныя парады, як дапамагчы хлопцам і дзяўчатам у перажыванні гэтага важнага, але складанага перыяду. Сёлета прыйшла ідэя падрыхтаваць велікапосныя календары для дзяцей па прыкладзе Адвэнт-календароў. Працавала над імі цягам тыдня, у выніку атрымаўся камплект: асноўны плакат 30х40 см, плакат з заданнямі (абодва ламініраваныя), сцікеры ў выглядзе ножак і – у якасці бонусу – набор наклеек, якія бацькі могуць захаваць і падарыць дзіцяці на Вялікдзень.



Сэнс календара ў тым, каб, выканаўшы чарговае заданне, наклеіць “ножку” на плакат, і такім чынам за 40 дзён адноўленым “датупаць” да ўваскрослага Езуса. Пастановы падбірала так, каб засяродзіць духоўнае развіццё дзіцяці на асноўных момантах.

1. Прызвычаіць вывучаць Біблію. Гэта дапаможа паверыць, што праўдзівыя менавіта галоўныя хрысціянскія падзеі, а не казкі пра Пасхальнага труса. У адным з заданняў трэба прачытаць урывак з Евангелля паводле св. Яна. Ён павінен зрабіць акцэнт на Радаснай Навіне, не перагружаючы дзяцей мукай Хрыста.

2. Наблізіць да бацькоў праз супольнае выкананне заданняў: сумесную малітву або наведванне родных.

3. Трэніраваць сілу волі праз пэўныя адрачэнні і, разам з тым, рабіць дабро на карысць іншым.

4. Навучыць заўважаць сваю годнасць. На жаль, савецкі менталітэт, які ўсё яшчэ не знік, прызвычаіў дарослых больш крытыкаваць, чым хваліць сваіх дзяцей, таму некаторыя заданні дапамогуць ім усвядоміць сваю каштоўнасць.

Вялікі пост у сэрцах малых

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
21.02.2021 00:00



Наклейкі як падарунак на Вялікдзень.



Вялікі пост у сэрцах малых

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
21.02.2021 00:00



